# АНТОН АБРАМОВІЧ – КАМПАЗІТАР, ЭТНАМУЗЫКОЛАГ, ПЕДАГОГ

## Жыццёвы шлях і творчая спадчына выдатнага дзеяча беларускай культуры



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар культуралогіі, прафесар

**Праца па вывучэнні жыццёвага шляху і багатай творчай спадчыны кампазітара Антона Абрамовіча ў айчынным музыказнаўстве толькі пачынаецца. Між тым яго імя заслужана можна аднесці да сузор'я імён выдатных музыкантаў М. К. Агінскага, М. Гузікава, М. Ельскага, Ф. Міладоўскага і інш., якія ў XIX стагоддзі годна і ярка прадставілі мастацкую культуру беларусаў далёка за межамі сваёй Бацькаўшчыны.**

### Ад класічных мелодый – да народных матываў

Толькі зусім нядаўна ўдалося ўдакладніць год і месца нараджэння Антона Іванавіча Абрамовіча. Як сведчаць «Посемейные списки обывателей, жительствующих в Витебской губернии», Антон Абрамовіч нарадзіўся ў 1811 г. у сям'і беззямельнага шляхціца Івана Васільевіча Абрамовіча, які зарабляў на жыццё «навукай і ўрокамі ігры на фартэпіяна па розных памешчыках» [3]. З самага маленства Антон апынуўся ў музычным асяродку. Яго старэйшы брат Іван таксама быў здатным музыкантам, добра валодаў выканальніцкай тэхнікай, нават даваў урокі ігры на фартэпіяна дзецям памешчыка Сіпайлы. Можна меркаваць, што фартэпіяннае майстэрства Антон асвойваў пад кіраўніцтвам бацькі і старэйшага брата.



Прырода адарыла хлопчыка не толькі абсалютным музычным слыхам, але і тонкім адчуваннем музычных вобразаў. Маленькі Антон бездакорна выконваў складаныя музычныя творы і нават перарабляў іх з неўласцівай для яго ўзросту фантазіяй і палкасцю. Ён рана навучыўся здабываць з піяніна гукі незвычайнай сілы і дзівоснай прыгажосці. Піяніста-вундэркінда неўзабаве пачалі запрашаць на музычныя імпрэзы, якія ладзіліся ў сядзібах багатых мясцовых дваран. Звычайна канцэрты адбываліся ў прысутнасці невялікай колькасці сяброў якой-небудзь уплывовай і заможнай асобы. Не было ў Антона недахопу і ў прапановах выкладаць музыку дзецям заможнай шляхты. Але юнак усё больш і больш лавіў сябе на думцы паказаць свае творчыя здольнасці патрабавальнай і дасведчанай публіцы вялікіх гарадоў, а таксама прафесійным музыкантам. У канцы 1820-х гг. гэтая мара здзейснілася. Антону Абрамовічу пашчасціла перабрацца ў Пецярбург. Беларускі фалькларыст і публіцыст Рамуальд Падбярэзскі (1812–1856 гг.) пісаў, што Абрамовіч «знаходзіцца ў Пецярбургу ўжо больш за дзесяць год; ён вядомы публіцы сваімі музычнымі кампазіцыямі» [5, с. 110].

Тагачасная сталічная публіка хутка прызнала ў беларускім юнаку таленавітага выканаўцу класічнай музыкі, аддала заслужаную даніну яго высокаму прафесійнаму майстэрству. Імпанавала пецярбургскім меламанам і тое, што ў рэпертуары піяніста з Паўночна-Заходняга краю нярэдка фігуравалі апрацоўкі папулярных рускіх народных песень. Неўзабаве Антон Абрамовіч пачынае ўключаць у праграмы сваіх канцэртаў уласныя фантазіі на тэму рускіх народных твораў.

З цягам часу кампазітар імкнецца скарыстаць у сваёй творчасці і беларускія этнічныя традыцыі. Ён быў цвёрда перакананы: беларускія народныя песні маюць высокую мастацкую вартасць. Абрамовіч цалкам пагаджаўся з выказваннем вядомага фалькларыста А. Ф. Рыпінскага, які пісаў, што ў натуральных тонах народных песень «ёсць нейкая нявыказаная прывабнасць, чароўная сіла, якая ўзнімае сэрцы і захапляе, здзіўляе самой нават прастатой» [2, с. 126]. Традыцыя, як вядома, прадугледжвае пэўную варыятыўнасць сродкаў захавання і прадстаўлення нацыянальнай культурнай спадчыны.

Пэўнага вопыту выкарыстання беларускага фальклору ў прафесійнай музыцы да таго часу не было. Р. Падбярэзскі адзначае, што А. Абрамовіч быў першапраходцам у гэтай справе: «Пан Абрамовіч, родам беларус, беручыся за зусім новую справу і да гэтага часу незакранутую тэму, калі яе хораша павядзе, можа стварыць рэч зусім арыгінальную і заняць выключнае месца ў касмапалітычнай еўрапейскай музыцы. Урыўкі, якія мы чулі, захапілі нас таксама, як і ўсіх слухачоў, землякоў кампазітара, якія лепш маглі меркаваць аб арыгінальнасці народных мелодый» [5, с. 43]. У далечыні ад роднай Віцебшчыны кампазітар імкнуўся данесці да расійскага слухача асаблівасці беларускага фальклору, народнага меласу. Антон Абрамовіч пачынае больш актыўна ўключаць у свае фартэпіянныя і вакальныя сачыненні элементы беларускага песеннага і танцавальнага фальклору. Так, на балах Дваранскога сходу ў Пецярбургу з поспехам выконваліся яго кадрыль «Шэсць пор года», Вялікі канцэртны вальс, «Паланэз, прысвечаны беларусам», дзясяткі мазурак, галопаў. Зварот музыканта да беларускіх матываў быў падтрыманы не толькі прадстаўнікамі нашай айчыннай мастацкай інтэлігенцыі, але і многімі рускімі кампазітарамі і выканаўцамі.

Такая ўвага да яго інавацый натхніла Антона Іванавіча на сістэматычную творчую працу ў дадзеным кірунку. Так, у першым томе «Rocznik Literacki» былі змешчаны чатыры беларускія песні, пакладзеныя на музыку («Гарэліца» і «Дзеванька» на словы Я. Баршчэўскага) або апрацаваныя (народныя «Зязюлька» і «Дуда») Абрамовічам.

## ✍ Фартэпіянная паэма «Беларускае вяселле»

Ад асобных беларускіх мелодый, пакладзеных на ноты, Абрамовіч марыць перайсці да стварэння больш буйных па памеры музычных твораў у нацыянальным духу. У яго выспявае арыгінальная задума: стварыць музычную паэму на падставе беларускага вясельнага абраду. У працэсе працы над паэмай кампазітар абапіраўся на тэкстуальны запіс абраду вяселля, зроблены вядомым фалькларыстам Р. А. Падбярэзскім, які адзначаў, што віцебскія і полацкія вяселлі вылучаюцца гучнасцю, квяцістасцю, багаццем традыцый. Фалькларыст удала перадаў тыя моўныя асаблівасці і мастацка-выяўленчыя сродкі, якія сведчылі пра арыгінальнасць вясельнага абраду на Віцебшчыне. Р. Падбярэзскі быў дакладным не толькі ў апісанні ходу вяселля (сватаўство, «лямант маладой», дзявочы вечар, прыезд да царквы, хор у царкве, бацькоўскае благаславенне, кругавая, танцы і г. д.), але і ў адлюстраванні адзення, музычных інструментаў, убрання двара, хаты [6, с. 99].

Перад кампазітарам Абрамовічам паўстала няпростая задача – перадаць усё багацце і разнастайнасць беларускага вяселля з яго песнямі, танцамі, звычаямі і звычаннямі музычнымі сродкамі. Трэба было не толькі шырока выкарыстоўваць мелодыі беларускіх песень і танцаў, але і ўвасобіць характэрныя прыёмы народнага музіцыравання, тыповыя для народнай музыкі інтанацыйныя, рытмічныя і гарманічныя абароты. Важную ролю ў музычнай паэме Абрамовіча адыгрывалі адметныя гукавыяўленчыя эфекты. Праграмная для кампазітара фартэпіянная паэма «Беларускае вяселле» лічыцца адметнай з'явай у беларускай музыцы XIX ст. Гэты музычны твор – першы прыклад творчага супрацоўніцтва кампазітара і фалькларыста. Сучасныя музыказнаўцы па жанравых параметрах кваліфікуюць фартэпіянную паэму Абрамовіча як мнагачасткавую сюіту праграмнага зместу [1, с. 57].

Працуючы над гэтым творам, кампазітар удала перадаў песенную паэтычнасць, высокую мастацкую вартасць меласу беларускага вяселля. У паэме ўмела спалучаны выяўленчыя сродкі, абумоўленыя як уласцівасцямі народнай, так і заходнееўрапейскай гармоніі.

У васьмі частках гэтага ўнікальнага для свайго часу твора перад слухачом паўстае каларытная, маляўнічая карціна беларускай вёскі, якая нібыта ўзята непасрэдна з натуры. Ва «Уступе» чуюцца ціхія гукі дуды. Паступова яны ўзмацняюцца, набліжаюцца, абвяшчаючы прыезд

сватоў. Распазнаецца топат конскіх капытоў, грукат колаў, бомканне званочкаў пад дугой... Адбываецца «Сватанне». Свае лірычныя пачуцці выказваюць Сват і Сваццproperly. Няўпэўненая ў сваім лёсе горка плача, галосіць нявеста, склікаючы сяброўак на «Дзявочы вечар». Крыху пазней чуллівай песняй дзяўчына развітваецца з бацькоўскім домам. Цалкам на беларускіх народных мелодыях грунтуюцца часткі «Прыезд у царкву», велічальны «Хор у царкве», «Блаславенне». Заканчваецца паэма вясёлым народным танцам «Кругавая». Усе радуюцца шчасцю маладых.

А. Абрамовіч – выдатны майстар гукавых карцін. Напрыклад, у частку «Плач дзяўчыны», якая пакідае бацькоўскі дом і не ведае, што яе чакае наперадзе, творца ўдала ўключае мелодыю народнага танца «Кросны», што гучыць тут як песня. Арыгінальны гукапісны эфект часткі «Прыезд у царкву», дзе ўрачыста ў гонар маладых гучаць званы. Кампазітару ўдалося максімальна наблізіцца да гука-высотнай структуры урачыстага царкоўнага звону.

У фартэпіяннай паэме «Беларускае вяселле», як і у іншых музычных творах А. Абрамовіча, паўнавартасна выявіліся яго яркае музычнае мысленне, здольнасць да стварэння вобразаў шырокага эмацыянальнага дыяпазону.

## Роданачальнік айчыннай музыкі

Беларускі мелас выразна праслухоўваецца таксама і ў сюіце Абрамовіча «Шэсць пор года» («Вясна», «Дзявочае лета», «Лета», «Бабіна лета», «Восень», «Зіма»). Тут па-майстэрску выкарыстаны ўстойлівыя інтанацыйныя структуры, уласцівыя для беларускіх народных песень.

У маршы «Інферналь» відавочная інтанацыйная блізкасць з беларускімі народнымі калыханкамі. Такая нечаканая жанравая інтэрпрэтацыя народнапесеннага матэрыялу надае музыцы А. Абрамовіча своеасаблівасць і непаўторнасць. Народным каларытам прасякнуты і такія яго творы, як «Зачараваная дуда», «Беларускія мелодыі» і інш.

За сваё кароткае, на жаль, жыццё (памёр кампазітар пасля 1854 г.) Антон Абрамовіч напісаў на дзіва вялікую колькасць разнажанравых музычных твораў. Р. Падбярэзскі, характарызуючы мастацка-творчую дзейнасць таленавітага маэстра, падкрэсліваў: «І таму клапатлівае збіранне народных матываў з'яўляецца найвялікшай заслугай нашага кампазітара, з'яўляецца менавіта тым бокам яго дзейнасці, да якога павінны быць накіраваны ўсе яго намаганні, бо менавіта тут знаходзіцца шлях, які запэўніць яму выключную славу і ганаровае месца паміж кампазітарамі» [4].

Айчынныя музыказнаўцы лічаць, што Антон Абрамовіч напісаў прыкладна 50 фартэпіянных і вакальных твораў. На наш погляд, музычная спадчына таленавітага беларускага кампазітара і этнамузыколага яшчэ багацэйшая. Асобныя яго творы («Фантазія для фартэпіяна», вальсы, мазуркі) можна знайсці ў «Музычным альбоме», які выдаваўся ў сярэдзіне XIX ст. у Пецярбургу Люцыяй Рыцінскай, у віленскім альманаху «Паментнік Наукова-Літэрацкі». Кароткія звесткі аб яго музычнай творчасці ўтрымліваюцца ў «Слоўніку старажытных і сучасных польскіх музыкантаў», выдадзеным у Парыжы ў 1847 г., а таксама ў «Слоўніку польскіх музыкантаў», апублікаваным у Варшаве ў 1964 г. І гэта яшчэ адно сведчанне таго, што Антон Іванавіч Абрамовіч заняў пачэснае месца сярод самых знакамітых кампазітараў Еўропы XIX стагоддзя. Ён стаў выдатным прапагандыстам беларускага народнага меласу, менавіта з яго творчасці пачынаецца ў поўным сэнсе гэтага слова айчынная музыка.

Значны ўнёсак зрабіў Антон Абрамовіч і ў музычную педагогіку. У Пецярбургу вялікай папулярнасцю карыстаўся яго «метад навучання ігры на фартэпіяна», з дапамогай якога многія выканаўцы дасягнулі выдатных поспехаў. У нарысе, прысвечаным А. Абрамовічу, Р. Падбярэзскі адзначаў, што кампазітар карыстаўся славай старраннага і таленавітага педагога. Свой шматгадовы педагагічны вопыт Антон Іванавіч імкнуўся распаўсюдзіць і ў іншых гарадах Расійскай імперыі. У сярэдзіне 1840-х гадоў ён стварае дыдактычную працу «Школа для фартэпіяна». Паводле яго задумы дадзены твор павінен быў стаць вучэбным дапаможнікам для настаўнікаў фартэпіяннай ігры. Праўда, да нас гэтая дыдактычная праца не дайшла. Магчыма, яе рукапіс знаходзіцца ў якім-небудзь архіве і чакае свайго даследчыка.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Капилов, А. Л.** Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX веков / А. Л. Капилов, Е. И. Ахвердова. – Минск: Институт современных знаний, 2000. – 144 с.
2. **Мальдзіс, А. І.** Падарожжа ў XIX стагоддзе. З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры: навук.-папул. нарысы / А. І. Мальдзіс. – Мінск: Народная асвета, 1969. – 206 с.
3. **Посемейные списки обывателей,** жительствующих в Витебской губернии // ЦДГА Республики Беларусь. – Фонд 1416. – Воп. 2. – Спр. 7077. – Л. 6.
4. **Падбярэзскі, Р. А.** Беларускае вяселле / Р. А. Падбярэзскі // Rocznik Literacki. – Petersburg, 1844. – Т. 1.
5. **Podberecki, R.** Antoni Abramowicz – muzyk / R. Podberecki // Rocznik Literacki. – Petersburg, 1844. – Т. 3.